грамадству. У былых прыгонных павышаўся ўзровень пісьменнасці і самасвядомасці, адначасова рос і духоўны запыт. Прамысловыя рабочыя, былыя сяляне, пазнаёміліся з жыццём гараджан, набылі рознага кшталту новыя звычкі, погляды, перакананні. Іх светапогляд станавіўся больш «гарадскім»: важнае значэнне надавалася працы на прамысловых прадпрыемствах, а сельская гаспадарка для іх паступова адыходзіла на другі план, і з цягам часу такія сяляне пачалі лічыць сябе прамысловымі рабочымі.

**Літаратура**

1. Алексашина, Г. В. Наемные работники в городах Беларуси: состав, правовое и экономическое положение (1890–1913 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Г. В. Алексашина. – Минск, 2019. – 222 л.

2. Бурачонак, А. В. Развіццё прадпрымальніцтва ў фабрычна-заводской вытворчасці Беларусі (1861–1914 гг.) : дыс. … канд. гіст. навук : 07.00.02 / А. В. Бурачонак. – Мінск, 2012. – 151 л.

3. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) : дыс. … док. гіст. навук : 07.00.02 / А. Г. Каханоўскі. – Мінск, 2014. – 340 л.

4. Липинский, Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии (II половина XIX в.) / Л. П. Липинский. – Минск : Наука и техника, 1971. – 252 с.

5. Панютич, В. П. Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861–1914 гг.) / В. П. Панютич. – Минск : Издательство «Наука и техника», 1969. – 192 с.

## Шлосберг Яфім Паўлавіч: навуковая ніва і доля

*Савасцюк Ц. С., студ. II к. БДУ,*
*навук. кір. праф. Яноўскі А. А., канд. гіст. навук*

Першая палова XX стагоддзя для Беларусі характарызуецца цяжкасцю з-за праходзячых важных сусветных і рэгіянальных падзей. Жыццё змянілася ва ўсяго насельніцтва, у тым ліку ў навуковым асяроддзі. Адзін з людзей, што сваёй біяграфіяй дэманструе гэты цяжкі час з нечаканымі зменамі, – Шлосберг Яфім Паўлавіч.

Будучы вучоны нарадзіўся ў Вільні, у 1928 г. скончыў педагагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і працягваў займацца навукай. З 1937 г. займаў пасаду загадчыка кафедры гісторыі ў Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце, дзе працаваў да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны [1, с. 345–346]. Некаторыя крыніцы акцэнтуюць увагу на нацыянальнасці Яфіма Паўлавіча – яўрэй [2].

23 чэрвеня 1941 г., знаходзячыся ў Мінску, ён быў прызваны ў савецкую армію, ужо паспеўшы стаць кандыдатам гістарычных навук. Змагаўся за айчыну

разам з іншымі калегамі-вучонымі, такімі як Дзяніс Дудкоў, і аспірантамі – Адамам Залескім, Зіновіем Капыскім і іншымі [3, с. 3]. Яфім Паўлавіч быў прызваны і служыў у 207-й стралковай дывізіі, таксама быў звязаны з 79-м стралковым корпусам і 3-й ударнай арміяй. За гераізм і самааданасць Радзіме быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, медалямі «За абарону Масквы», «За перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна». Я. П. Шлосберг удзельчаў у баях за такія гарады, як Чарнігаў, Смаленск, Віцебск, Быдгашч, Шчэцін. Скончыў свой баявы шлях у званні маёра [4].

Вучоны даследаваў сацыяльна-эканамічную гісторыю беларускіх зямель XVIII–XIX стст., і яго працы нават сёння выкарыстоўваюцца профільнымі навукоўцамі. Напрыклад, пры разгляданні асноўных форм рэнты, вучоны выказваў меркаванне, што толькі паншчына была распаўсюджана на тэрыторыі Беларусі, што выклікала пратэст сярод іншых вучоных [5, с. 177–178]. Пільна разглядаліся інвентары, якія паказвалі эвалюцыю феадальнага спосабу вытворчасці і распад феадальна-прыгонніцкай сістэмы. Сучасныя даследчыкі, аналізуючы тэксты Я. П. Шлосберга звяртаюць увагу і на тое, якую вялікую каштоўнасць маюць артыкулы ў галіне сацыяльнай гісторыі, а дэмаграфічныя даныя як раз не з'яўляюцца асноўнай крыніцай [6, с. 146].

Пасля вайны навуковец змог працягнуць сваю працу. У 1948 г. Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР надрукаваў працу «Аб асноўных пытаннях гісторыі БССР», складальнікамі якой былі Яфім Шлосберг, Мікалай Нікольскі, Уладзімір Перцаў, Аляксей П'янкоў, Канстанцін Шабуня, Канстанцін Палікарповіч. Апублікаваная праца павінна была дапамагчы сістэматызаваць пытанні па складанні гісторыі Беларусі [3, с. 3].

У тым жа годзе на кар'еры дзеяча мог быць пастаўлены крыж. 6 лістапада 1948 г., падчас кампаніі па барацьбе з касмапалітызмам, ён быў арыштаваны Міністэрствам дзяржаўнай бяспекі БССР. У наступным годзе яму прысудзілі 10 гадоў лагераў, адбываў пакаранне ў Іркуцкай вобласці. У 1955 г. Судовая калегія Вярхоўнага суда БССР тэрмін знаходжання пад арыштам зменшыла да 7 гадоў. Ужо на 9 мая 1956 г. быў рэабілітаваны, з таго часу да 1964 г., нягледзячы на дрэнны стан здароўя пасля высылкі, працаваў у Інстытуце гісторыі [1, с. 345–346]. Яфім Паўлавіч пасля вяртання ў навуку, удзельнічаў у складанні выдання АН БССР «Истории Белорусской ССР» у двух тамах. З'яўляўся складальнікам супольна з такімі выбітнымі навукоўцамі, як Лаўрэнцій Абэцэдарскі, Майсей Грынблат, Эдуард Загарульскі і іншыя [7].

Яфім Паўлавіч Шлосберг сваімі старонкамі біяграфіі, апублікаванымі працамі і сваёй асобай ілюструе мадэль таго чалавека, што прайшоў цяжкія дзесяцігоддзі развіцця, гвалту, а потым і рэабілітацыі. Шанаванне ўніверсітэцкіх і акадэмічных працаўнікоў застаецца важнай ступенню для разумення працэсаў ў любы перыяд гісторыі.

**Літаратура**

1. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі. 1794–1991 : энцыклапедычны даведнік : у 3 т. – Т. 2 : Лавіцкі – Ятаўт. – Мінск, 2003. – 380 с.
2. Шлосберг Ефим Павлович // Бессмертный барак. – URL: https://bessmertnybarak.ru/books/person/326436/ (дата обращения: 01.03.2025).
3. Навіцкі, У. Цэнтр гістарычнай думкі / У. Навіцкі // Голас Радзімы. – 1999. – 3 ліст. – С. 3, 10.
4. Шлоссберг Ефим Павлович // Память народа. – URL: https://goo.su/BTvbIaG (дата обращения: 01.03.2025).
5. Люты, А. М. Сялянская гаспадарка ў Беларусі ў другой палове XVIII – першай палове XIX ст. / А. М. Люты, А. Э. Лютая // Европа: актуальные проблемы этнокультуры : сб. науч. ст. / Белорус. гос. пед. ун-т ; редкол. : В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2013. – С. 177−179.
6. Беларускі археаграфічны штогоднік. – Вып. 12. – Мінск : БелНДІДАС, 2011. – 298 с.
7. История Белорусской ССР : в 2 т. – 2-е изд. – Минск : Издательство Академии наук БССР, 1961.

# Культурный туризм как инструмент «мягкой силы» Вьетнама

*Сапоненко А. А., Смальцер В. С., студ. I к. БГУ,*
*науч. рук. Миксюк А. С., канд. ист. наук, доц.*

В эпоху глобализации и интенсивного международного взаимодействия культура может рассматриваться в качестве важного инструмента «мягкой силы», способствуя динамичному и стабильному развитию государства, расширению и укреплению его международных связей. «“Мягкая сила” во вьетнамской культуре является важным элементом, который обеспечивает синергию и повышает национальную конкурентоспособность» [1]. Материальные объекты и нематериальные ценности культурного наследия, а также культурная самобытность, природа Вьетнама стали основой его «мягкой силы», ресурсом и движущей силой развития страны.

«Мягкая сила», в отличие от жестких методов воздействия, опирается на улучшение имиджа страны, способность вызвать у людей интерес и симпатию. У путешественников, посещающих исторические места Вьетнама, участвующих в традиционных праздниках и пробующих национальную кухню, складывается позитивный образ страны, который они распространяют за границами Вьетнама.

Культурный туризм – вид туризма, который развивается благодаря эксплуатации страной культурных ценностей и способствует популяризации